## II. ПАСЛЯ З'ЕЗДА РАЙПЛАНАЎ ПРАЙШЛО ЗВЫШ 4-х МЕСЯЦАЎ, А ПЕРАБУДОВА ПЛАНАВЫХ КАМІСІЙ ПРАХОДЗІЦЬ МАРУДНА. АРГАНІЗАЦЫЯ АПОРНЫХ ПЛАНАВЫХ КАМІСІЙ— МАГУТНЫ ВАГАР У ПЕРАБУДОВЕ УСЕЙ ПЛАНАВАЙ СІСТЭМЫ

---

**Н. М. Галадзед.**

# Работу райпланаў—на новыя рэйкі

*(З выступлення на 1-м усебеларускім з'ездзе райпланаў).*

У перыяд другой пяцігодкі капіталісты ўсіх краін не толькі зразумелі, але і прызналі сутнасць планавання усей народнай гаспадаркі ў Совецкім Саюзе. Зараз вы не знойдзеце самага заклятага ворага Совецкага Саюзу, калі ён не сышоў з ума, які-б сёння высмейваў наш план. Газеты ўсіх краін, усіх напрамкаў пішуць, што задачы, якія паставіў перад сабой Совецкі Саюз на другую пяцігодку патрасаюць выабражэнне чалавека наогул. Мы да гэтай формулы дадаем, што яны патрасаюць не толькі выабражэнне чалавека, але патрасаюць яны і асновы капіталізма.

Разумеючы прынцыповае значэнне плана, якое фармуляваў Уладзімір Ільіч, мы адначасова не з'яўляемся педантамі, не лічым план непахісным. Большэвікі заўсёды выходзяць з таго, што вызначаныя асновы плана з'яўляюцца непахіснымі, але карэктывы ў працэсе жыцця мы ўносім і будзем унасіць, бо няма такіх планаў, якія-б на пяць або на 10 год прадугледзілі ўсё да самых дробязей. План ёсць канкрэтная дырэктыва, але ва ўсякай дырэктыве ўсяго не ўбачыш. Значыць, трэба ў працэсе жыцця ўнасіць канкрэтныя карэктывы. У працэсе жыцця, работы, практыка падсказвае, што трэба паправіць у намечаным плане і мы гэта робім, але асновы плана застаюцца непахіснымі. А ў некаторых нашых работнікаў на практыцы дапускаюцца дзве крайнасці: адны думаюць, што калі план складзен, значыць ад плана ні на крок адступіць нельга, другія лічаць, што план складзен, але можна з ім не лічыцца, наогул глядзяць на нашы планы як на фармальную рэч і пачынаюць на заўтра вынасіць дзесяткі новых рашэнняў аб пабудове новых прадпрыемстваў, новых аб'ектаў. Часамі атрымліваецца так, што праз 2 месяцы, як быў прынят план, яго нельга пазнаць. І гэта некаторыя гаспадарча непісьменныя людзі называюць „аперацыйным кіраўніцтвам". Як у адным, так і ў другім выпадках ёсць скажэнне ленінскай ідэі—ідэі Сталіна аб народна-гаспадарчым плане. У працэсе жыцця ў нас могуг быць перастаноўкі, мы гэта ў арганізаваным парадку і робім, але не змены плана. План партыяй прымаецца для таго, каб канцэнтрыраваць галоўныя сродкі і сілы на рашаючых участках соцыялістычнага будаўніцтва, каб драц-

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы